Ігуменскі тракт
№ 42 (57)

■ Спадчына ў законе

РЭВАЛЮЦЫЙНАЯ, 28:

Помнік гісторыі ці будаўнічая пляцоўка?

Скандал разгарэўся з-за таго, што будынак у самым сэрцы сталіцы — яе гістарычным цэнтры — папросту знявечылі. Пазбівалі старую ляпніну, быццам яна ніякай каштоўнасці сабой не ўяўляла, сцены ўцяплілі і старую аўтэнтычную тынкоўку закрылі бетонам. Таму цяпер дом на Рэвалюцыйнай, 28 не ўпрыгожвае вуліцу, а наадварот, выклікае здзіўленне і разгубленасць: «А як такая недарэчнасць магла з'явіцца тут, у адным з найпрыгажэйшых месцаў Мінска?» Абурэнне людзей дайшло і да Міністэрства культуры, якое выдала прадпісанне спыніць работы на гэтым аб'екце да высвятлення ўсіх абставінаў.

Апошнія дзесяцігоддзі дом стаяў занядбаны. У 2008—2009, а таксама ў 2012 гадах на ім былі праведзены даследаванні, якія выявілі, што ён знаходзіцца ў нездавальняючым стане. Планавалася яго адрэстаўраваць і прыстасаваць пад гандлёвыя і офісныя функцыі. Падчас даследавання быў высветлены першапачатковы характар фасадаў, знойдзены сляды колішняга балкона, нават кавалак кафлі з арнаментам ад ацяпляльнай печы. Аказалася, што калісьці на галоўным фасадзе была арка, праз якую можна было праехаць унутр двара. Паабапал аркі таксама былі дэкаратыўныя элементы, аднак падчас «рэстаўрацыі» іх знішчылі.

Сучасны выгляд будынка на Рэвалюцыйнай, 28.

Цяпер дом дарэвалюцыйнай пабудовы нагадвае каробку, залітую бетонам. З'яўляецца адчуванне, што тыя, хто займаўся будынкам, проста не ўспрымалі яго як гістарычную каштоўнасць. Адзінае, што зрабілі будаўнікі — пры збіванні тынкоўкі і ляпніны захавалі ўзоры кожнага ляпнога профілю. Дакументацыя па рэстаўрацыі была распрацавана праектным інстытутам «Мінскграмадзянпраект». Аднак ажыццяўляць тэхнічны нагляд за выкананнем работ на аб'екце — гэта таксама задача і заказчыка (у гэтым выпадку камунальна-ўнітарнага прадпрыемства «Мінская спадчына»). Ён жа праводзіў тэндар і выбіраў таго, хто будзе рабіць рэстаўрацыю.

Так будынак на Рэвалюцыйнай, 28 выглядаў да рэстаўрацыі — у 2008 годзе.

Начальнік Упраўлення па ахове гісторыка-культурнай спадчыны і рэстаўрацыі Ігар ЧАРНЯЎСКІ пацвердзіў, што Міністэрства культуры выдала прадпісанне на спыненне работ на Рэвалюцыйнай, 28 і патлумачыў такое рашэнне:

— Работы, якія вяліся на гэтым аб'екце, не адпавядалі дакументацыі. Па-першае, яны зрабілі таркрэт — нанеслі слаі бетону там, дзе гэтага рабіць было нельга. Па-другое, правялі ацяпленне, якое не было ўзгоднена. А па-трэцяе, адбілі дэкаратыўныя элементы. Нідзе ў свеце так не робіцца: маюцца прадпісанні, што рабіць, калі сцены страцілі сваю трываласць, як у гэтым выпадку. Ёсць шмат спосабаў іх умацаваць, аднак вонкава яны абавязкова павінны захоўваць сваю аўтэнтычную гістарычную адметнасць. Гэты будынак дзясяткі гадоў стаяў і нікім не рамантаваўся. Аднак мы не будзем ставіць пытанне, хто давёў яго да такога стану. Больш істотна тое, што адбываецца там цяпер.

Цяпер Міністэрства культуры прапанавала заказчыку падаць на разгляд дакументацыю вядзення работ на гэтым аб'екце. Бо зацверджаны праект рэстаўрацыі ёсць, аднак тое, што робіцца з будынкам, яму не адпавядае. Знешне здаецца, што дом ужо не выглядае як адметная старадаўняя пабудова. Нягледзячы на гэта, Ігар Чарняўскі кажа, што са спіса гісторыка-культурных каштоўнасцяў дом будзе складана выключыць, бо ён фарміруе цэнтр старога горада. А ўвесь гістарычны цэнтр — гэта і ёсць каштоўнасць. Але пакідаць усё так, як ёсць, нельга, упэўнены начальнік Упраўлення па ахове спадчыны:

— Нехта павінен панесці адказнасць. Калі б здарыўся адзін такі прэцэдэнт і некага пакаралі, іншыя б задумаліся. Мы складаем адміністрацыйныя пратаколы, выпісваем штрафы, аднак гэтым усё абмяжоўваецца. Я не за тое, каб некага саджаць у турму, аднак органы, якія адказваюць за выкананне заканадаўства, павінны распачаць такую справу. Бо сёння наша міністэрства проста завалена зваротамі грамадзян з просьбай даць экспертную ацэнку пэўным рэстаўрацыйным работам. У гэтым выпадку адказным будзе заказчык — «Мінская спадчына». Яны атрымалі дазвол на выкананне работ і выбіралі падрадчыка.

Кафля, знойдзеная падчас даследаванняў.

Сёння сітуацыя ў беларускай рэстаўрацыі складваецца так, што тэндар на самі работы можа выйграць хто заўгодна: фірма, якая ўчора будавала кароўнік, заўтра можа перайсці на помнік архітэктуры, але ж на апошнім патрэбны зусім іншыя навыкі. Таму адзіным выйсцем з такой сітуацыі, каб не дапускаць разбуральных памылак у будучыні, бачыцца прапісванне ўмоў тэндара: каб муляры валодалі неабходнымі навыкамі, каб архітэктар быў вопытным і ўжо меў на сваім рахунку некалькі запраектаваных будынкаў.

Для адной з найпрыгажэйшых вуліц Мінска, Рэвалюцыйнай, знявечанне дома № 28 — гэта далёка не першы ўдар. Пабудовы, якія знаходзіліся за ім, папросту знесены. Не стала і дома № 24а. Літаральна за некалькі дзён да знішчэння ў ім былі знойдзены старадаўнія роспісы. Іх трэба было хаця б правільна зняць, аднак часу на гэта не хапіла. Адным суботнім вечарам да яго пад'ехаў бульдозер. Гэта ўбачыў спецыяліст, які працаваў непадалёку. Ён адразу стаў тэлефанаваць ва Упраўленне па ахове спадчыны, аднак там ужо нічым дапамагчы не змаглі, дом знеслі. Знайшоўся адзін будаўнік, які проста сабраў кавалкі тынкоўкі з роспісам у каробку і аддаў рэстаўратарам такі своеасаблівы пазл...

Ва ўсім свеце забудоўшчыкі лічаць старыя пабудовы хламам, які нікому не патрэбны. Яны гатовы знесці любую гістарычную каштоўнасць, каб узвесці штосьці больш высокае і з больш дарагой арэнднай платай. Аднак усюды ёсць і тыя, хто зрабіць ім гэтага ніколі не дазволіць. А калі ў гістарычных кварталах і будуецца штосьці новае, то пры гэтым ёсць умова, каб створаны будынак выглядаў як аўтэнтычны.

Старшыня Добраахвотнага таварыства аховы помнікаў гісторыі і культуры Антон АСТАПОВІЧ выказаў сваю думку наконт сітуацыі з будынкам па Рэвалюцыйнай, 28:

— Уся праблема з-за таго, што адсутнічаюць тэхнічныя правілы, якія рэгулююць выкананне рэстаўрацыйных работ. Любой стадыяй аднаўлення будынка — ад распрацоўкі праектнай дакументацыі да выканання работ — можа займацца хто заўгодна. Заканадаўства ёсць, аднак пад яго маркай часта адбываецца ўзаконенае разбурэнне помнікаў. Таму на выхадзе мы бачым не адрэстаўраваны аб'ект, а звычайную пошлую мадэрнізацыю. І справа не ў гэтым канкрэтным будынку. Некалькі гадоў таму былі скасаваны ліцэнзіі на рэстаўрацыйныя работы — цяпер імі могуць займацца і непрафесіяналы, літаральна любы ахвотны. Акрамя таго, дрэнна працуе інстытут навуковых кіраўнікоў. Бо за кожным аб'ектам замацоўваецца навуковы кіраўнік, аднак прафесіяналаў сярод іх, на жаль, можна пералічыць па пальцах. Можна назіраць і тое, што спецыяліст не мае паўнамоцтваў на аб'екце, які распрацоўваў. Дакументацыя можа ўзгадняцца, мінуючы яго, непасрэдна з заказчыкам. Наша таварыства даўно б'ецца над тым, каб былі вернуты ліцэнзіі на вядзенне рэстаўрацыйных работ, каб выкарыстоўваліся нарматыўныя зборнікі, якія рэгламентуюць дзеянні на аб'ектах, што маюць гісторыка-культурную каштоўнасць, аднак пакуль усё безвынікова. Таму дом па Рэвалюцыйнай, 28 — гэта толькі кропля ў моры.

Відавочна, што гэты гістарычны будынак мы ўжо «прайгралі». Аднак ёсць яшчэ шмат іншых, лёс якіх залежыць ад таго, хто будзе да іх дакранацца: звычайныя будаўнікі ці спецыялісты, што маюць рэстаўрацыйныя навыкі.

Ніна ШЧАРБАЧЭВІЧ, фота аўтара

■

■ Радавод

ДАРАГАНЫ ВЯРТАЮЦЦА Ў АСІПОВІЧЫ

Прадстаўнікі славутага дваранскага роду наладзілі цесныя сувязі са сваёй малой радзімай

У жыцці Асіповіцкага краю род Дараганаў адыграў вялікую ролю. Дзякуючы ім у XIX стагоддзі з'явілася ветка чыгункі ад Асіповіч да Старых Дарог, паміж вёскамі Крынка і Дараганава была насыпана дарога, адкрыліся лесапільня, бровар і яшчэ шмат чаго. Пасля рэвалюцыі гэтае прозвішча было незаслужана выкраслена з гісторыі, а маёнткі Восіпа і Мацвея разрабаваны. Але тры гады таму сувязь з гэтым родам зноў пачала аднаўляцца. Сёлета сюды прыехаў са Швецыі прапраўнук Восіпа Дарагана — Андрэй. Ён прывёз з сабой каля 300 розных рэчаў, якімі валодалі яго продкі.

Рэліквіі збіралі ўсім светам

Перад тым, як сустрэцца з Андрэем Дараганам, не магла не зазірнуць у тыя мясціны, дзе некалі жылі яго сваякі. Дваццаць хвілін язды на цягніку Асіповічы — Салігорск па той самай чыгунцы, якую ў пачатку XX стагоддзя пабудавалі браты Восіп і Іван, а таксама муж іх сястры Лізаветы — Мацвей, і ты ў Дараганава. Дарэчы, 40 кіламетраў чыгуначнага палатна, дзве станцыі, два раз'езды, два чыгуначныя масты былі зроблены ўсяго за 8 месяцаў. Будоўля не спынялася нават ноччу. Першы цягнік прыйшоў на станцыю Радуцічы 28 снежня 1986 года.

У музеі Дараганаўскай школы нават захавалася тэлеграма, дзе якраз пра гэту падзею гаворыцца. Наогул, музей тутэйшай школы славіцца тым, што ў ім знаходзіцца адна з найбагацейшых калекцый па гісторыі краю, у тым ліку і некаторыя рэчы саміх Дараганаў. Калісьці ўсё гэтае багацце пачала збіраць захопленая справай Зінаіда Верашчака. Цяпер захоўвае і папаўняе мясцовую гісторыю таксама неабыякавая да яе Жанна Караленя.

Музей і сапраўды ўражвае. У двухпавярховым будынку захоўваецца каля 4 тысяч экспанатаў — усё тое, што атрымалася сабраць за 30 гадоў існавання музея. Большая частка іх належыць да паслярэвалюцыйнага перыяду. Рэчаў былых гаспадароў няшмат: усяго 7. Дзякуй неабыякавым людзям, якія не пашкадавалі ні часу, ні сіл, каб захаваць памяць продкаў. Я сустрэлася ў музеі з Ларысай Сідараўнай Стоцкай. Яна цяпер на пенсіі, але роднай школы, дзе яна працавала бібліятэкарам, і тым больш музея, для якога сабрала шмат розных рэчаў, не забывае. Гісторый пра Дараганаў яна ведае шмат. Слухаеш яе і здаецца, быццам бы яна пра некага са сваіх сваякоў распавядае.

— Вось гэтыя крэслы, пераплеценыя ратангам, Лізавета Дараган сваёй пакаёўцы падаравала, — кажа яна, убачыўшы, што я з цікаўнасцю разглядваю старадаўнюю мэблю. — А стол быў большы за гэты і квадратны. У гарнітур уваходзіла шафа, падобная да той, што вы тут бачыце, але ж гэта не дараганаўская.

Андрэй ДАРАГАН (злева) на сямейным фота разам з маці.

— Буфет нам аддала адна з мясцовых жыхарак, ён стаяў у яе ў сенцах, — далучаецца да гутаркі Жанна Караленя і з горыччу дадае: — Ёсць тут у адных людзей шафа, сервант, стол і канапа Лізаветы Дараган, але яны з імі не жадаюць расставацца. Мэбля, вядома, каштуе вялікіх грошай, але яны прадаваць нам яе і не збіраюцца. Ведаюць, што ў нас такіх грошай няма».

Вядома, грошай на музейныя экспанаты школе ніхто не выдзяляе. Але, каб набыць нешта каштоўнае, тут гатовыя ісці на любыя ахвяры. І прыкладаў гэтаму хапае.

— Вось сасновая палка, якая належала самаму Восіпу Дарагану, — Жанна Сямёнаўна бярэ ў рукі дэкараваны кій. — Ён яе аддаў свайму кіраўніку з вёскі Буда, і яна доўгі час там і захоўвалася. Калі стваралася музей, Зінаіда Верашчака выменяла яе на 40 літраў газы. А вось на ратангавыя крэслы грошы выдаткаваў рана.

Сярод каштоўных рэчаў — чыгуначны звон, які вісеў на станцыі Дараганава да 1976 года, марцірка XVIII стагоддзя, з дапамогай якой некалі ладзілі святочныя феерверкі, карты пачатку XX стагоддзя, каштоўныя дакументы.

На сувязі з Дараганамі

Нястомная Жанна Караленя настолькі захапілася пошукамі звестак пра знатны род, што нават змагла наладзіць кантакты з іх нашчадкамі. Яна напісала пісьмо прапраўнучцы Восіпа Дарагана Надзін Маршанд у Францыю, дзе паведаміла, што іх род памятаюць, што яго ўклад у развіццё краю нельга пераацаніць. Жанчына, якая 19 гадоў нікому не адказвала, праз паўгода адклікнулася. Яна падказала адрас яшчэ адной прапраўнучкі Восіпа — Вольгі Дараган-Сушчовай, якая жыве ў Пецярбургу. Пасля гэтага ў Асіповічы сталі наведвацца нашчадкі асіповіцкіх Дараганаў. Сярод іх і Андрэй са сваёй жонкай Ланай. Менавіта тады яны выказалі думку стварыць асобны музей.

На памяць аб тых сустрэчах у памятнай кніжцы музея засталіся запісы. Лідзія і Юрый Дараганы-Сушчовы напісалі, што былі вельмі ўражаны тым, што ўбачылі, абяцалі падзяліцца фотаздымкамі і копіямі дакументаў. Наогул удзячных водгукаў вельмі шмат. Цікава, што музей наведвае каля тысячы чалавек у год. Турысты прыязджаюць нават з-за мяжы.

Ад фамільнага абруса да дзедавай піжамы

З Андрэем Дараганам мы сустрэліся ў будынку асіповіцкага моладзёва-падлеткавага цэнтра «Равеснік», дзе ў 5 залах плануецца размясціць прывезеныя экспанаты. Далёкая дарога і мытныя клопаты наклалі свой адбітак. Андрэй трохі прастудзіўся, але быў задаволены вынікам сваёй паездкі.

— Каб зрабіць гэты крок, мне спатрэбілася ажно 2 гады. Тут усё, што датычыцца майго роду. Я гэта збіраў доўгі час, — паведаміў ён.

Рэчаў і на самой справе шмат. Іх нават яшчэ не паспелі і распакаваць. Каб я ўяўляла, што схавана ў каробках, Андрэй дастае з сумкі здымкі. На адным з іх жанчына з грудным дзіцем на руках і маленькім кучаравым хлопчыкам. «Гэта мая маці, а хлопчык — я», — тлумачыць ён і звяртае ўвагу на абрус, які ляжыць на стале — ён сярод тых рэчаў, якія Андрэй прывёз са Швецыі. У спісе ёсць нават сярпы і косы, крэслы, стол, дзіцячыя цацкі і шмат чаго іншага. Андрэй прывёз нават дзедаву піжаму, з якой той падарожнічаў па свеце. Шмат экспанатаў, якія датуюцца мінулым стагоддзем, але ёсць і такія, якім 200—300 гадоў. «Усе гэтыя рэчы для мяне вельмі каштоўныя, нельга выбраць нешта адно, — кажа Андрэй. — Паасобку яны нічога не ўяўляюць, але калі іх размясціць усе разам, гэта будзе сямейны скарб. Яго нельга прадаць, яго можна толькі захоўваць».

Андрэй і далей збіраецца папаўняць музей, збіраецца запрасіць усіх сваіх сваякоў з Вашынгтона, Парыжа, Стакгольма прыняць удзел у гэтай справе. Яшчэ ён думае перадаць некалькі фамільных абразоў царкве ў Дараганава.

Калі можна будзе ўбачыць у музеі тыя экспанаты, што правёз Андрэй Дараган, пакуль цяжка сказаць. Як патлумачыла дырэктар Асіповіцкага гісторыка-краязнаўчага музея Антаніна Сцяпанава, зараз вырашаецца пытанне, як размясціць усё гэтае багацце. Андрэй збіраецца прыехаць будучым летам з эскізамі інтэр'ера будучага музея. Мяркуецца, што адна з пяці залаў будзе распавядаць пра дараганаўскі род у фотаздымках. Але толькі для таго, каб іх аформіць, спатрэбіцца шмат грошай, якія трэба яшчэ знайсці.

Нэлі ЗІГУЛЯ. Фота аўтара

■

ПАХОДЖАННЕ БАБАК У ЛІТВЕ:

неверагодная гісторыя ад Ігнацыя Яцкоўскага

БАЙКІ кухмістра ВЕРАШЧАКІ

Навагрудскі адвакат і таленавіты літаратар Ігнацы Яцкоўскі, той самы, што адкрыў публіцы творчасць сялянскага паэта Паўлюка Багрыма, данёс да нас таксама неверагоднае паданне пра тое, адкуль завяліся бабкі ў Вялікім Княстве Літоўскім. Не, не «грошы» на жаргоне, а вялікія духмяныя круглыя бабкі, найсмачнейшы далікатэс класічнага велікоднага стала. Гэта сёння слова «бабка» выклікае асацыяцыю з бабкай бульбяной. Але ў часы Яцкоўскага (сярэдзіна XIX ст.) бульбяныя бабкі былі ў нас яшчэ рэдкасцю, дый назву сваю яны атрымалі ад бабак мучных, па аналогіі, гэтаксама як і многія іншыя стравы з бульбы атрымалі ў спадчыну назвы ад мучных папярэднікаў. Саму гісторыю Яцкоўскага строгія гісторыкі кулінарыі лічаць хутчэй анекдотам або байкай. Яна перадае не рэальную атмасферу Літвы адразу пасля Крэўскай уніі, але тое, як яе ўспрымалі паланізаваныя «літвіны» сярэдзіны XIX ст. Бо на тыя часы папулярнасць і бабкі, і коўенскага «ліпца» налічвала некалькі стагоддзяў, неабазнаным жа ў гісторыі людзям здавалася, што так было заўжды. Што ж, наша гісторыя такая доўгая і глыбокая, у ёй так шмат часавых пластоў, што кожнае пакаленне мусіць адкрываць яе для сябе нанава. І, мабыць, не так важна, калі велікодныя бабкі і пітны мёд з'явіліся на сталах нашых продкаў, як тое, наколькі мы іх шануем сёння і ўмеем гатаваць.

Што ж толькі, мой Божа, тыя караняжы (жыхары Кароны — польскае часткі Рэчы Паспалітай) на літвінаў не нагаворваюць, сцвярджаючы, што да іх саміх трэба ехаць па розум, а на Літву па грошы. А тут аказваецца, што калі наш Ягайла ажаніўся з Ядвігаю з Кароны, дык яму было сорамна, што яго жонка не мае чым прыняць гасцей у сябе, бо ў яе — ні аптэчкі, ні вяндліны. Дык вось, агледзеўшыся крыху ў доме, кароль Ягайла зразумеў, што ад нязручнасці гэтае інакш не пазбавішся, як толькі падгаварыўшы Ядвігу паехаць на Літву пад маркай хрышчэння паганцаў, да чаго яна як кабета мела надзвычайную слабасць, а па сутнасці, каб паказаць сваёй жонцы, якія там былі гаспадыні.

Дык у 1387 годзе на Папялец (Першы дзень Вялікага поста, калі святар пасыпае вернікам галовы попелам), паводле караняжскага календара, — бо літвіны яшчэ Папяльца не ведалі — пачцівы Уладзіслаў Ягайла са сваёю маладою прыгожаю Ядвігаю прыехаў у Вільню, а не было ў той час ані кавы, ані гарбаты ва ўжытку. Звычайна ў Кароне поліўка піўная з сырам і грэнкамі займала тое месца, а на Літве ўжо было сёе-тое лепшае, каб прыняць каралеву.

Пані Карыбутава, братавая Караля, княгіня Наваградская, прыйшла да яе раніцаю ў шыкоўным, хатняе работы пудэрмане (вопратка, якая завязвалася пад шыяю і не мела рукавоў) і загадала ўнесці за сабою на сярэбраным падносе ў залатых кубках поліўку з коўенскага мёду, прыпраўленую жаўткамі свежых яек і рознымі каранямі, а да яе — сухарыкі і печыва, якое сама зрабіла. Маладая Ядвіга, адказваючы на ласкавасць літвінкі прыроджанаю ветлівасцю, у якой караняжы да гэтага часу нікому не даюць сябе апярэдзіць, сеўшы за сняданак, не ведала, як гэта зрабіць, бо лыжак на стале не было, а без лыжак піўную поліўку ў Кракаве не елі. Кароль, убачыўшы ейны клопат, папрасіў Карыбутаву, каб і яна села за стол ды паказала каралеве прыклад, як трэба есці. Пані Карыбутава, думаючы, што каралева яе падазрае, ці няма ў ежы атруты, доўга не адмаўляючыся, села за стол і, памачаўшы кавалак пірага ў поліўцы, пачала снедаць, нахіляючы залаты кубак. Трымала яго за абодва вушкі даматканаю, з літоўскага льну, сурвэткаю, вышытаю ўрыянскім жомчугам.

Форма для бабак.

Каралева, паглядзеўшы на гэта, падумала сабе: «Трэба ёй гэта дараваць і зрабіць гэтаксама, бо літвіны яшчэ паганцы, а таму дзікуны». Але калі тым самым спосабам яна пакаштавала тае поліўкі з кубка, прызначанага для яе, дык пачалі пазіраць: каралева на печыва, а кароль, шчаслівы, што справіў жонцы такую прыемнасць, на каралеву; а потым азваўся да яе напалову жартам, напалову трыумфуючы:

— А што, каханая, няма ў нас такіх прысмакаў у Кракаве?

А яна з захапленнем усклікнула:

— Ой, ба! Ба! Каб жа мы гэта мелі!

І ў працяг размовы сказала княгіні Карыбутавай:

— А якое ж вы незвычайнае піва маеце!

Княгіня Наваградская, якая ў той час не ведала яшчэ ані слова па-польску, пакланілася каралеве, не ведаючы, што адказаць; застаўся ў яе ў памяці толькі той выклічнік «Ба! Ба!», і ад таго паходзіць назва бабы, якую пазней пяшчотна перайменавалі ў бабку.

А кароль, смеючыся, дадаў:

— Але гэта не піва, гэта — коўенскі ліпец.

Каралеве гэта так прыпала да смаку, што з таго часу загадвала, каб ёй заўсёды давалі такі сняданак. Яе прыклад адразу перанялі паны і пані, якія прыбылі з Кароны, і коўенскі мёд падняўся ў цане. А закон бернардынаў, які праз некалькі гадоў быў там заснаваны, атрымаў ад караля прывілей рабіць мёд на продаж, што яму ў той час забяспечыла добры прыбытак.

Шкада, што тая маладая, прыгожая і добрая каралева нядоўга жыла, бо ўжо сакрэтам, як рабіць бабкі і вяндліну, што называлася за мяжою сальцісонам, пачала добра вучыцца. Аднак з тае прычыны, што яна не рабіла гэтага ўласнымі рукамі, як у той час рабілі літоўскія пані, а загадвала рабіць кухарам, дык тыя свае вучоныя рэцэпты склалі, а вярнуўшыся дадому, дорага прадалі іх караняжам. Але і дагэтуль у Кароне няма ані добрае бабкі, ані добрае вяндліны.

Рэцэпт:

Бабы (пірагі) цяжкія, што доўга не чарсцвеюць, вельмі смачныя, Вінцэнтыны Завадскай (з «Кухаркі літоўскай»)

Складнікі: *1 л мукі, 1/2 шклянкі топленага масла, 1 шклянка малака, 50 г дражджэй, 10 жаўткоў, 5 цэлых яек, 200 г цукру, 65 г салодкіх мігдалаў (міндалю), 130 г разынак без костачак, 65 г цукатаў або смажанай у цукры апельсінавай цэдры, соль. Алей і паніровачныя сухары для формы.*

Прыгатаванне: *палову мукі развесці цёплым малаком, змяшаным з дражджамі, добра перамяшаць і пакінуць у цёплым месцы, каб расло. Калі цеста ўзнімецца, далівать пакрысе, старанна перамешваючы, добра ўзбітыя яйкі (уключаючы жаўткі). Дасыпаць рэшту мукі і ўзбіваць цеста, пакуль не пачне адставаць ад рук. Усыпаць цукар, уліць топленае масла пакаёвай тэмпературы, дадаць крыху солі. Урэшце ўкінуць мігдалы (лепш тонка нарэзаныя ўздоўж), разынкі, цукаты, вельмі старанна размяшаць і пакласці ў змазаныя алеем і абсыпаныя сухарамі формы, запоўніўшы іх напалову. Калі цеста добра падрасце, выпякаць у гарачай печы 1 гадзіну 15 хвілін.*

■ Выстава

ЛОЖАК ДЛЯ РАДЗІВІЛА

Арыгінальны спальны гарнітур XIX стагоддзя набылі на аўкцыёне «Sotheby's»

Так выглядаў гарнітур у інтэр'еры.

15 прадметаў мэблі, якімі карысталіся прадстаўнікі славутага роду, знойдуць месца ў пакоях Нясвіжскага палаца. Але пакуль ёсць магчымасць паглядзець на гэтыя рэчы: да лютага 2014 года гарнітур прадстаўлены ў выставачнай зале палацавага ансамбля.

Нельга сказаць, што гэта была выпадковая знаходка: супрацоўнікі музея вялі мэтанакіраваную працу па падборы экспанатаў для палацава-замкавага комплексу — у прыватнасці, для аднаўлення тагачаснай атмасферы ў апартаментах княгіні. Аднак гарнітур быў зроблены для князя Канстанціна Радзівіла, які не жыў у Нясвіжы, але наведваў родных на радзіме. Род Радзівілаў вельмі разгалінаваны. Канстанцін Радзівіл, пра якога ідзе гаворка, быў нашчадкам Мікалая Кшыштафа Радзівіла «Сіроткі» ў сёмым калене. З нясвіжскімі Радзівіламі ён кантактаваў: у 1914 годзе ў Парыжы сустракаўся з Антоніем Радзівілам і яго жонкай Марыяй дэ Кастэлян.

Асобныя рэчы камплекту ў стылі «праванс».

Што да мэблі Канстанціна Радзівіла, выраблена ў стылі Людовіка XVI, то вядома, што гэты гарнітур знаходзіўся на яго віле дэ Дзюн у Канах. Камплект з такой вялікай колькасцю прадметаў, верагодна, быў падзелены на два пакоі. І, магчыма, у Нясвіжы яго падзеляць на два экспазіцыйныя комплексы — гэта спальня і малая сталовая зала.

Пра тое, што гарнітур мае дачыненне да гісторыі Радзівілаў, сведчыць фамільны герб на некаторых прадметах.

Ларыса ЦІМОШЫК

■